НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

№ 19 (109), ЛІСТАПАД 2010 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

*Беларусь,*
*твой народ*
*дачакаецца*
*Залацістага,*
*яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

## НАРОДНАЕ ВЕЧА НА ЗАГАДУ ПРЭЗІДЭНТА

Паводле афіцыйных даных 6-7 снежня ўлады актыўна рыхтуюць правядзенне гэтак званага Усебеларускага народнага сходу. Склікаецца сход на аснове артыкула 37 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і ў мэтах рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян удзельнічаць у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця. На сходзе плануецца абмеркаваць рэалізацыю Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2006-2010 гады, вызначыць курс развіцця краіны на бліжэйшую пяцігодку. Новая Праграма будзе прынята з улікам народнага меркавання дэлегатаў, якія прыбудуць на сход – кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка ганарыцца тым, што ён заўсёды раіцца з народам па стратэгічных пытаннях. Ён лічыць, што калі будзе такім чынам абапірацца на народ, то "абваліць краіну нікому не ўдасца". Пры гэтым удакладняе, што галоўныя "абвальшчыкі" Беларусі – Расія, Еўразвяз, Амерыка, чамусьці ў гэты спіс нядобразычліўцаў трапіла і Украіна. Чацвёрты Усебеларускі сход пройдзе ў сталіцы рэспублікі, у якім прымуць удзел дзве с палова тысячы чалавек, у тым ліку і дэлегацыя ад нашага раёна. У падрыхтоўчы перыяд да прадстаўнічага форуму ў працоўных калектывах нашага раёна прайшло вылучэнне ўпаўнаважаных на раённы сход. Усяго было вылучана 236 упаўнаважаных. Найбольшую долю склалі работнікі прадпрыемстваў і арганізацый аграрнага сектара. 5 лістапада ўпаўнаважаныя сабраліся на раённы сход у Шуміліне, на якім выбіралі прадстаўнікоў на народны форум. У выніку галасавання дэлегаты працоўных калектываў ШумілінШчыны аднагалосна абралі дэлегатаў на Усебеларускі сход. Дэлегатамі сталі чыноўнікі: начальнік раённай пошты Анацка К. Г., дырэктарка Шумілінскага гарадскога Дома культуры Іванова М. І., галоўны аграном саўгаса "Сіроцінскі" Басаў С. П. Узначаліў дэлегацыю старшыня Шумілінскага райвыканкама В. А. Падляшчук, у дапамогу кіраўніку раёна прызначылі старшыню райсавета Новікаву І. М. З гэтай нагоды В. А. Падляшчук выступіў перад сходам з дакладам, у якім расказаў аб сацыяльна-эканамічным становішчы раёна. Вальдэмар Антонавіч адзначыў, што нягледзячы на складанасці бягучага года, удалося захаваць станоўчую дынаміку развіцця асноўных галін эканомікі раёна. Што тычыцца працэдуры дэмакратычнасці абрання "прадстаўнікоў народа" на Усебеларускі сход, то гэта пытанне застаецца адкрытым. Па першае, свабоднай інфармацыі для грамадзян наогул у раёне не было. Дзяржаўны друк ухіліўся ад інфармавання, ніякіх аб'яў на гэтую тэму на дошках не было. Безумоўна, у працоўных калектывах зацверджаны пэўны парадак абрання ўпаўнаважаных, таксама прапісана, колькі павінна быть чалавек і ад якіх арганізацый. У арганізацыі павінна быць больш за 30 чалавек. Таксама можна было вылучыцца праз партыю, у якой больш за 100 тысяч сяброў. Але ўступіць у такую партыю не атрымаецца, бо падобных у Беларусі пакуль не існуе. Таму застаецца варыянт вылучэння толькі праз грамадскія аб'яднанні. Такіх, якія налічваюць больш за сто тысяч толькі тры: БРСМ, Белая Русь і Федэрацыя прафсаюзаў. Цікава, што можна было вылучыцца і праз сход жыхароў двара – іх павінна быць усяго 300 чалавек. Яны могуць абраць аж 20 дэлегатаў. Але ні на пад'ездах дамоў, ні ў ЖЭСах, ні ў крамах, інфармацыю пра гэта, на жаль, не вывешвалі. Таму адміністрацыя працоўных калектываў наўпрост правяла мерапрыемствы па прызначэнню сваіх чыноўнікаў на Усебеларускі сход. Відавочна, што кіраўніцтва нашага раёна "само сябе выбрала". Ды і сам сход павінен адбыцца ў адпаведнасці з указам № 531 кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі. Зрэшты, даўно вядома, што гэта чыста піяраўскае мерапрыемства, каб паправіць палітычны імідж дзейнага кіраўніка Беларусі. Варта нагадаць, што выбары ён прызначыў на восем месяцаў раней тэрміну. Між тым і эканамічная сіуацыя складаная, а ў бліжэйшы час можа пагоршыцца яшчэ больш. Трэба думаць, што і самі "вылучэнцы ад народа" з большага разумеюць, што ўдзельнічаюць у чарговым перадвыбарчым спектаклі.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## П'ЯНСТВА ЗА РУЛЁМ

Супрацоўнікамі дзяржаўтаінспекцыі каля вёскі Язвіна былі затрыманы двое жыхароў з вёскі Ляжні. І кіроўца легкавіка, і пасажыр знаходзіліся ў нецвярозым стане. У горпасёлку Обаль былі затрыманы два мясцовыя жыхары, якія ехалі нецвярозымі. Усім вадзіцелям пагражае буйны штраф да 30 базавых велічынь, або пазбаўленне вадзіцельскіх правоў на тры гады.




## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале http://kamunikat.org/, дзе зацікаўлены грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: http://kamunikat.org/svitanak.html , што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

## Зменшыліся заробкі

**Сярэдняя заработная плата, налічаная работнікам Шумілінскага раёна за верасень 2010 года, складае 907616 рублёў. Да зарплаты ў жніўні бягучага года яна зменшылася на 0,6 адсоткаў. Па асноўных галінах зарплата за верасень складае ў рублях:**

| | |
|---|---|
| **Прамысловасць** | **924069** |
| **Сельская гаспадарка** | **731771** |
| **Будаўніцтва** | **1282749** |
| **Гандаль і грамадскае харчаванне** | **803269** |
| **Жыллёва-камунальная гаспадарка** | **1079693** |

## ФАРМІРАВАННЕ ЎЧАСТКОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

У адпаведнасці з каляндарным планам 3 лістапада ў Шумілінскім раёне завершылася фарміраванне ўчастковых выбарчых камісій. На падставе пратакокаў сходаў палітычных партый, працоўных калектываў, грамадскіх аб'яднанняў і заяваў грамадзян раёны выканаўчы камітэт зацвердзіў 31 участковую камісію на адпаведных участках для галасавання. У склад камісій увайшлі 281 чалавек, гэта прадстаўнікі розных прафесій, якія працуюць на дзяржаўных прадпрыемствах , арганізацыях і установах. Варта адзначыць, што ўпершыню за ўсю гісторыю раёна мясцовыя ўлады ў рэшце рэшт прапусцілі ў камісію і актывіста дэмакратычнай апазіцыі. У склад участковай камісіі на ўчастку для галасавання № 15 (аграгарадок Амбросавічы) уключаны Шчамлёў А. М., які вылучаўся ад Віцебскага грамадскага аб'яднання "Самаўпраўленне і грамадства". У сярэднім у выбарчых камісіях налічваецца па 7–9 чальцоў, самы большы ўчастак для галасавання № 4 (Меліяратыўны) мае 13 чальцоў, меней за ўсіх на ўчастку № 31 (Бальнічны) – 5 чальцоў. На месцах ужо адбыліся пасяджэнні ўчастковых выбарчых камісій, на якіх былі выбраны кіраўнікі. У кіруючы склад камісій былі выбраны ў асноўным прадстаўнікі дзяржаўнага апарату: старшыні СВК, начальнікі арганізацый, дырэктары школ і прадпрыемстваў, галоўныя спецыялісты. Надоечы першымі пачалі сваю вучобу кіраўнікі ўчастковых камісій. 11 лістапада ў вялікай зале Дома Саветаў адбыўся семінар, на якім прысутнічалі старшыні, намеснікі старшынь і сакратары ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Уступным слова вучобу адкрыў намеснік старшыні Шумілінскага райвыканкама А. М. Зайцаў, які падкрэсліў асаблівы статус тых людзей, якіх прызначылі кіраваць камісіямі на выбарах. Тым больш, што ў раёне склалася пастаяннае кіруючае ядро ва ўчастковых камісіях, якія маюць вопыт некалькіх выбарчых кампаній. Аб арганізацыйных пытаннях у ходзе перадвыбарнай кампаніі расказала начальнік па кадрам райвыканкама Н. У. Захарава. Пра гатоўнасць памяшканняў для правядзення выбараў паведаміла старшыня раённай камісіі С. Д. Вярцінская. На нараду былі запрошаны і спецыялісты электрасувязі, работнікі культуры, гандлю, дарожнай службы і камунгасу. А шумілінскам выбаршчыкам застаецца спадзявацца на тое, што выбары будуць праведзены згодна з законам.

**Я. Вайтовіч.**

## АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя « Світанка » змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам***

# ЯК ПЕРАТВАРАЮЦЬ КАЛГАСЫ Ў АГРАГАРАДКІ

Кожны жыхар Шумілінскага раёна бачыць, як зменьвае выгляд сельскіх населеных пунктаў будаўніцтва гэтак званых аграгарадкоў. У чым сутнасць аграгарадкоў? Напэўна ў тым, каб людзі маглі жыць і працаваць ва ўмовах максімальна прыблізаных да гарадскіх, і ў той жа час працаваць на сельскай ніве. У апошні час знешнюю прывабнасць набылі пасёлак Светласельскі, Мікіціха, Амбросавічы, Язвіна. Новы від набылі гандлёвыя кропкі, Фапы, КПП, установы культуры, сацыяльныя аб'екты. У большасці выпадкаў гэта адрамантаваныя памяшканні, якім было па 30-40 гадоў. Праўда, сюды завезлі новае абсталяванне, пабагацеў асартымент тавараў, пашырыліся паслугі сувязі: высокахуткасны інтэрнэт і інтэрактыўнае тэлебачанне. Але ж гэта толькі вонкавая прывабнасць адноўленай вёскі. А што насамрэч хаваецца за домікамі, ўпрыгожанымі дэкаратыўнай агароджай? У якім стане знаходзіцца, напрыклад, вытворчая сфера? У адным з выступленняў прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага прагучала даволі крытычнае выказванне ў адрас аграгарадкоў Віцебшчыны. З 600 пабудаваных дзяржавай аграгарадкоў у вобласці даюць прыбытак толькі 20. Сяргей Сідорскі папракнуў кіраўніцтва вобласці, што маўляў, можа здарыцца так, што пабудавалі не фабрыкі па вытворчасці сельгаспрадукцыі, а «потёмкинские деревни». Нягледзячы на высілкі Ураду па мадэрнізацыі калгасна-саўгаснай сістэмы, яе эканамічная эфектыўнасць застаецца на нізкім узроўні. Тым не менш, будаўніцтва аграгарадкоў на Шумілiншчыне працягваецца. У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай адраджэння сяла ў Крывым Сяле з пачатку года вядзецца будаўніцтва аграгарадка. Павольна, крок за крокам, вядзецца рэканструкцыя старых аб'ектаў. Паводле кіраўніка СВК "Прыдзвінскі" В. І. Дзятлава, на тэрыторыі майстэрні і жывёлагадоўчых фермаў заасфальтавалі пляцоўкі, адрамантавалі пад'езды. У бок калгаснай канторы праклалі ходнікі, пралажылі новы асфальт на цэнтральнай вуліцы ў Крывым Сяле, аднавілі разбураны бардзюр. Для вяскоўцаў пабудавалі пакуль што чатыры новыя дамы, у наступным годзе плануюць узвесці яшчэ шэсць, ужо выдзелена месца каля саўгаснай сталоўкі. Завяршаюцца работы па аднаўленню сельскай амбулаторыі. У асноўным тут адрамантавалі дах, зрабілі ацяпленне, адрамантавалі кабінеты: працэдурны, акушэрскі, дзіцячы і прыёмны пакой. У аддзяленні паштовай сувязі ўстанавілі счытвальнік банкаўскіх картак, які дазволіць людзям больш зручна аплочаваць паслугі і здымаць грошы. А больш за ўсё грошай пайшло на рамонт Крывасельскай школы – каля 180 мільёнаў рублёў. Стары будынак цяпер не пазнаць: замянілі столь, падлогу і дзверы, уставілі новыя вокны. Як заверыў начальнік аддзела адукацыі райвыканкама П. У. Спірыдонаў, у наступным годзе будзе прыбудова да школы. У прыбудове будзе размешчаны дзіцячы садок. Сельскі Дом культуры таксама закрыты на рамонт, які абыйшоўся ў 70 мільёнаў. Але каб поўнасцю правесці рэканструкцыю старога памяшкання клуба, неабходна яшчэ 120 мільёнаў. Грошы патрэбны, каб не толькі праводзіць дыскатэкі, але і размясціць у клубе сучасную танцавальную і глядзельную залы. У чытальнай зале бібліятэкі зроблены рамонт, будзе сучаснае асвятленне, завязуць новую мэблю. З усяго відаць, што нямала робіцца для таго, каб у жыхароў вёскі было ўсё неабходнае для працы, і для быту, і для адпачынку. Улады спадзяюцца, што будучы аграгарадок у Крывым Сяле стане ўзорам культуры жыцця і паводзін. Палітыка цяперашняй улады скіравана на тое, каб затрымаць моладзь на вёсцы, каб ёй было на сяле цікава, стваралiся новыя сем'і. Каб вёска не апусцела, а гарады не былі перанаселены ўчарашнімі вяскоўцамі.

**С. Горкі.**

# Тры тысячы пытанняў кіраўніку дзяржавы

Сёлетняй вясною пачалася Рэспубліканская акцыя "Ліст Прэзідэнту", арганізаваная Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі. У кожнай школе настаўнікі ўстанавілі скрынку, куды вучні кідалі свае лісты, адрасаваныя кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку. Як вынікае з дзяржаўных крыніц інфармацыі, спектр пытанняў быў даволі шырокі: ад бытавых скаргаў да глабальных праблем знешняй палітыкі. Дайшлі да кіраўніка Рэспублікі Беларусь звыш трох тысяч пытанняў ад маладых людзей, у тым ліку і дваццаць лістоў ад школьнікаў нашага раёна. І вось нарэшце ў пачатку лістапада сем вучняў атрымалі адказы ад кіраўніка краіны. Сярод вучняў Навікоўскай базавай школы аказалася аж тры шчасліўцы: Андрэй Карагін, Андрэй Папіна і Марына Пяшко. Але чамусьці лісты ад Лукашэнкі не прыйшлі вучням так, як звычайна ідуць па пошце. Адпасаваныя ім адказы перахапіла ніжэйшае звяно бацькавай вертыкалі з раённага кіраўніцтва. Школьнікаў запрасілі ў райвыканкам, дзе іх сустрэла цэлая кампанія чыноўнікаў. Ва ўрачыстай атмасферы маладзёнам уручылі лісты ад кіраўніка дзяржавы намеснік старшыні райвыканкама А.М. Зайцаў, начальнік па справах моладзі М. Я. Ганчарова, сакратар ГА БРСМ Ю. С. Галуза, спецыяліст аддзела адукацыі А. В. Налецкая. Пра што пісалі дзеці Лукашэнку, засталося таямніцай. Шчыра кажучы, калі зыходзіць з таго, хто кіраваў акцыяй, дык ня цяжка здагадацца, хто на самай справе пісаў лісты да кіраўніка краіны. Хутчэй за ўсё дзеці пісалі лісты пад дыктоўку настаўнікаў, альбо тых жа функцыянераў з БРСМ. Уладам зараз не патрэбны ніякія самастойныя юнацкія ініцыятывы. Безумоўна, моладзь яшчэ можа больш-менш свабодна выказваць свае думкі, задаваць пытанні самым высокім начальнікам. Аднак цалкам верагодна, што мэта гэтай акцыі – не абуджэнне грамадскай ініцыятывы. Выбарчы фарс набліжаецца да фіналу, і ў гэтым выпадку, каб утрымацца ва ўладзе рэжым Лукашэнкі не грэбуе нічым. Татальныя піяраўскія мерапрыемствы паўзуць па ўсёй краіне. Тут табе і Усебеларускі сход, і асабісты аб'езд прадпрыемстваў , і грамадска-культурная акцыя "Беларусь – гэта мы", гала-канцэрты з удзелам вядучых зорак беларускай эстрады. І акцыя "Ліст Прэзідэнту" – таксама не выключэнне.

**Алесь Прыбярэжны.**

# Апошняя надзея

Чаму людзі звяртаюцца да самых вышэйшых прадстаўнікоў улады – дэпутатаў "Палаткі" па самых дробязных бытавых пытаннях? Здаецца, што для вырашэння праблем насельніцтва на месцах зроблена ўсё, калі не болей. Мясцовыя бюджэты маюць фінансавую падтрымку з цэнтра, паўнамоцтваў у раённых кіраўнікоў хапае, штаты ўкамплектаваны. А можа мае рацыю кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка, калі на пасяджэннях так эмацыйна крытыкуе рэгіянальных чыноўнікаў за чэрствасць і бяздушша ў адносінах да простых людзей? Як бы там ні было, але на чарговым прыёме грамадзян дэпутат "Палаткі" В. М. Байкоў пераканаўся, што ў нашым раёне некаторыя бытавыя праблемы зможа вырашыць толькі ён асабіста. Васіль Міхайлавіч выслухаў скаргі выбаршчыкаў на "прамой лініі", а затым правёў прыём грамадзян па асабістых пытаннях. На прыём прыйшло каля дзесяці чалавек. І ў большасці выпадкаў людзі скардзіліся на работу жыллёва-камунальнай службы. Ніхто ў раёне не змог вырашыць іх набалелыя пытанні. Нікаму не зрабілі капітальны рамонт, дзесьці пражавелі трубы ці наогул няма вады. Жыхарка дома № 1 Шляхтунова А. Е., мнагадзетная маці, звярнулася да Васіля Байкова, як да апошняга выратавальніка. Уся справа ў тым, што жанчына абыйшла ўсе інстанцыі, але праблему так і не вырашылі. У тым доме, дзе яна жыве, патрэскалася і адышла сцяна – гэта небяспечна для яе малалетніх шасцярых дзетак. Дэпутат Байкоў неадкладна даў распараджэнне камунгасу – у сваю чаргу яго кіраўнік В. А Коўзан абяцаў зрабіць рамонт у доме № 1 у самы бліжэйшы час. ВасільМіхайлавіч рэкамендаваў нашым шумілінскім начальнікам не спаць у шапку, а часцей сустракацца з людзьмі, працаваць на "апярэджванне праблем", шырэй выкарыстоўваць практыку платных паслуг. Дэпутата Байкова непакоіць той факт, што на такіх сустрэчах з выбаршчыкамі губляецца шмат часу. Прынамсі, асноўная місія парламентарыя – гэта складаная законатворчая праца ў Пастаянных камісіях. Дарэчы, сам Васіль Міхайлавіч узначальвае ў Парламенце камісію па дзяржаўнаму будаўніцтву і мясцоваму самакіраванню. А ў рэальным жыцці ён вымушаны браць на сябе абавязкі мясцовай прадстаўнічай і выканаўчай галін ўлады. Цяпер няхай нашы шумілінскія выбаршчыкі яшчэ раз добра падумаюць, хто з дэпутатаў раённага Савета выконвае свае абавязкі, а хто трапіў туды толькі для таго, каб адсядзець чарговы тэрмін.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## ЗДАРЭНІ. КРЫМІНАЛ

# КРАДЗЯЖЫ

У Шуміліне, на вуліцы 40 год Кастрычніка з гаспадарчай пабудовы невядомыя падабралі ключы да замка пабудовы, што належыць грамадзяніну В. і скралі два веласіпеды. Вядзецца вышук. На новым жывёлагадоўчым комплексе, што ў Башнях, прапала электраабсталяванне. Гаспадарцы "Баравінка" нанесены ўрон памерам у шэсцьсот тысяч рублёў. Серыя аўтаграбяжоў адбылася на вуліцах Сіпко, Юбілейная, 70 год БССР. Невядомыя зламыснікі здымалі з іншамарак акумулятары, магнітолы, запасныя колы, злівалі бензін. Легкавікі не былі абсталяваны сігналізацыяй і знаходзіліся ў неасветленых дварах. Усяго пацярпела дзесяць уладальнікаў легкавых машын. Падобныя крадзяжы здарыліся ў суседніх Бешанковіцкім і Гарадоцкім раёнах.

# Да Леніна з вянкамі

"День седьмое ноября – красный день календаря". За савецкім часам кожнаму вучню у школах убівалі ў свядомасць, што 7 лістапада – гэта вялікая падзея, гістарычная дата Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая паклала пачатак пабудове новага грамадства. Аднак тая новая гістарычная супольнасць – вялікі савецкі народ неўзабаве распаўся на самастойныя дзяржавы, пакінуўшы пасля сябе безліч сацыяльных, грамадска-палітычных і культурных праблем. Для людзей найбольш сталага веку гэта свята некалі было галоўным. На прадпрыемствах людзі рыхтаваліся да дэманстрацыі, стараліся добра ўпрыгожыць сваю калону, каб выглядала дастойна. На парад выходзілі войскі, па вуліцах Мінска ішла калона баявой тэхнікі. Зараз у гэты восеньскі дзень многія з настальгіяй успамінаюць слаўныя традыцыі святкавання 7 лістапада і тое пачуццё адзінства, якое звычайна панавала падчас масавых дэманстрацый працоўных. І сапраўды, яшчэ два гады таму, у 2007 годзе раённыя ўлады з размахам адзначылі 90-годдзе "пралетарскай" рэвалюцыі. Тады ў Шуміліне была арганізавана дэманстрацыя з прадстаўнікоў працоўных калектываў. Святочная калона пад гукі аркестра прайшла па плошчы, ля помніка Леніну адбыўся мітынг. Але на гэты раз жадаючых аддаць даніну павагі савецкаму мінуламу аказалася нямнога. 5 лістапада ў Шуміліне на цэнтральнай плошчы было зусім малалюдна. Але ўсё ж знайшлося некалькі дзесяткаў жадаючых успомніць сваю камсамольскую маладосць. Актывісты працоўных калектываў, прадстаўнікі ветэранскіх арганізацый нашага раёна сабраліся на мітынг ля помніка Леніну. Пад бетонныя ногі правадыру ўсклалі вянкі. На мітынгу выступілі намеснік старшыні Шумілінскага райвыканкама А. М. Зайцаў і старшыня раённай арганізацыі ветэранаў К. Ф. Палоўнікава. Яны казалі аб тым, што іх дзяды стварылі той падмурак, на якім і трымаюцца сённяшнія дасягненні раёна. У гарадскім Доме культуры перад прысутнымі выступіла старшыня раённага Савета дэпутатаў І. М. Новікава. Ірына Мікалаеўна станоўча ацаніла ролю Кастрычніцкай рэвалюцыі. На яе думку, 93 гадавіна – па-ранейшаму сімвалічная гістарычная дата, дзякуючы якой народ стварыў новую дзяржаву. Больш таго, менавіта савецкая ўлада дала магчымасць простым людзям атрымаць "бясплатную" адукацыю, лячэнне і адпачынак. Напрыканцы святочнага дня самадзейныя артысты райцэнтра далі канцэрт, на якім гучалі рэвалюцыйныя песні. На жаль, цяперашняя ўлада не ўсведамляе, што святкаванне на Беларусі самай жахлівай падзеі ў расейскай гісторыі – гэта проста блюзнерства. Бальшавіцкі пераварот паклаў пачатак фізічнага вынішчэння беларускай інтэлігенцыі, уцягнуў наш народ у грамадзянскую і Другую Сусветную Вайну. Не трэба забываць, што расейскі бальшавізм гвалтоўна зліквідаваў Беларускую Народную Рэспубліку, якую стварыла наша інтэлігенцыя разам з народам 25 сакавіка 1918 г. Пасля чаго беларусы на доўгія гады трапілі ў акупацыйную залежнасць ад Масквы. І толькі ў 1991 годзе зноў здабылі незалежнасць, якая і дагэтуль застаецца пад пагрозай.

**А. Шумскі.**

ПАЛІТЫКА

# МІЛІНКЕВІЧ ВЕДАЕ, КАЛІ КРЭМЛЬ АДХІЛІЦЬ ЛУКАШЭНКУ

***Масква паспрабуе зьмясьціць Аляксандра Лукашэнку з пасады прэзыдэнта на працягу паўтара года, цытуе агенцтва Bloomberg інтэрвію Аляксандра Мілінкевіча бэрлінскай газэце.***

**Аляксандар Мілінкевіч** заявіў, што галоўная палітычная інтрыга ў краіне пачнецца пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 19 сьнежня, якія, на ягоную думку, безумоўна, выйграе Аляксандар Лукашэнка. Паводле Мілінкевіча, пасля выбараў Расея паспрабуе зьмясьціць Лукашэнку з пасады прэзыдэнта.

Мілінкевіч кажа, што Масква, у якой у апошні час сапсаваліся адносіны з кіраўніком Беларусі, падтрымлівае як мінімум аднаго з будучых удзельнікаў сьнежаньскіх выбараў: замест дрэнна кіраванага Лукашэнкі ёй патрэбен чалавек, які «цалкам аддасьць Беларусь пад кантроль Расеі» і «спыніць любое збліжэньне з Эўропай». Пры гэтым Мілінкевіч не назваў нямецкім журналістам прозьвішча пракрамлёўскага прэтэндэнта.




«Выбары – толькі пачатак эпохі зьмен. Рашэньні будуць прымацца пасьля. Існуючы статус-кво ня можа захавацца», – цытуе **Bloomberg** інтэрвію Мілінкевіча адной з бэрлінскіх газэт.

Паводле яго, «у Расеі ёсьць шмат інструмэнтаў для таго, каб зьмясьціць Лукашэнку», і спробы Крамля могуць завяршыцца посьпехам на працягу паўтара года. Мілінкевіч лічыць, што Расея выкарыстае прэзыдэнцкія выбары для ўплыву на палітычную сітуацыю ў Беларусі. Спачатку Масква, магчыма, адмовіцца прызнаць вынікі галасаваньня. Аднак калі ў той жа самы час вынікі выбараў прызнаюць на Захадзе, то Расея апынецца «у глупым становішчы», упэўнены Мілінкевіч.

На думку Мілінкевіча, перад Лукашэнкам стаіць складаная дылема: «або змагацца з Расеяй» за танныя энэргарэсурсы, «або пачаць маленькія крокі па лібэралізацыі сыстэмы ў спадзяваньні атрымаць эканамічную дапамогу з Захаду».

Паставіць на чале Беларусі лаяльнага сабе чалавека Крамлю трэба да выбараў 2012 году, удакладнае **Ёрг Форбрыдж** – кіраўнік праграм Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы нямецкага аддзяленьня Фонду Маршала.

«Крэмль, як ніколі раней, блізкі да таго, каб скончыць свой нешчасьлівы шлюб зь беларускім кіраўніком. Лукашэнка высмоктвае расейскія рэсурсы, атрымлівае танныя нафту і газ, але не выконвае ні адно з палітычных патрабаваньняў Масквы. Ён стаў перашкодай для расейскага кіраўніцтва», – упэўнены палітолаг.

# О НАЦИОНАЛЬНЫХ СИМВОЛАХ И ЯРЛЫКАХ




**Алесь Михалевич**

Все-таки Марк Твен был гениальным писателем. Его рассказ «Как меня выбирали в губернаторы» стоит сделать обязательным к прочтению для каждого, кто выдвигается на выборы. Когда в процессе они, несомненно, узнают о себе много нового, то смогут смотреть на ситуацию с юмором.

Вот и меня в последнее время все чаще критикуют, навешивают ярлыки. Например, за позицию по вопросам, связанным с возможностью изменения национальной символики, придания Белорусскому языку статуса единого государственного.

Но поскольку классика я читал, то к критике отношусь спокойно. И вместо оправданий хочу поговорить о демократии, правовом государстве, принципе разделения властей и правах человека. Считаю необходимым начать именно с понимания этих основ, с того фундамента, на котором должно стоять сильное государство. Я уже говорил, что выдвигаюсь в президенты для того, чтобы модернизировать Беларусь. В том числе модернизировать политически, поскольку считаю важным фактором экономического процветания соответствие нашей страны всем современным европейским стандартам. Для этого мы должны в первую очередь сами научиться мыслить и действовать по-новому, в строгих рамках законности и демократии.

Ведь многие до сих пор считают, что все политики, которые борются за президентский пост, обязаны круглосуточно говорить исключительно про зверства преступного режима. А получив власть начинать деятельность с перекраивания государства «под себя».

Но всем нам давно пора было осознать, что президент должен оставаться главой исполнительной ветви власти, а не подменять своими решениями власть законодательную и судебную. И поскольку я это осознал, то стараюсь мыслить и действовать соответствующе.

Бело-красно-белый флаг мне дорог. И, как будущий президент, могу гарантировать включение его в Государственный список историко-культурных ценностей Беларуси, куда, кстати, уже включен герб «Пагоня». Но не могу и не имею права волевым решением изменить действующую государственную символику, так как это идет вразрез с законом, с конституцией.

Невозможно назначить демократию указом президента. Неправильно навязывать государству те символы или язык, которые больше нравятся действующему лидеру. Экономике не скомандуешь: «равнение на либерализацию, бегом марш!». Назначение человека виновным – вне правового поля.

Поэтому столь необходимо опираться на строгое соблюдение упомянутых выше базовых принципов. Только так мы сможем не на словах, а на деле модернизировать Беларусь. Я понимаю, что такой подход, скорее всего, приведет к дальнейшему навешиванию на меня ярлыков. Но не боюсь этого. Мало того, надеюсь, что упомянутый в начале статьи классик не обидится, если я позаимствую у него состоящую из ярлыков подпись:

«С совершенным почтением ваш, когда-то честный человек, а ныне: Гнусный Клятвопреступник, Монтанский Вор, Осквернитель Гробниц, Белая Горячка, Грязный Плут и Подлый Шантажист... Алесь Михалевич».

*Алесь Михалевич для «Белорусского Партизана».*


## Аб'ява

Каманда кандыдата запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Сувязь праз кантакты рэдакцыі выдання.

**Каманда Аляксея Міхалевіча** заклікае грамадзян падтрымаць мадэрнізацыю краіны.

Счёт в ОАО «АСБ Беларусбанк»
Михалевич Алексей Анатольевич
ОАО «АСБ Беларусбанк», счёт: 01048489.
Отделение 225 филиал 529 «Белсвязьбанк», код филиала: 720. Webmoney Кошелёк: B412474441803 (аттестат).


# БЕЛОРУССКУЮ ЭКОНОМИКУ «РАЗОГРЕЛИ» ПОД ВЫБОРЫ

Правительство все еще не теряет надежды выполнить высокие показатели, заложенные на 2010 год. Последние данные о финансовых потоках в стране показывают, что для достижения этой политической задачи правительство стремится «разогревать» экономику. Главным образом, благодаря населению.

Рост розничного товарооборота за январь-сентябрь этого года составил 16,2%. Это максимальное значение, начиная с 2008 года. Фактически можно говорить о том, что показатель розничного товарооборота вернулся на докризисный уровень.

Во многом рост розничного товарооборота был обеспечен благодаря правительственным мерам, направленным на стимулирование внутреннего спроса.

К числу таких мер можно отнести существенное повышение доходов населения. За январь-сентябрь средняя зарплата в Беларуси выросла на треть (до 1,3 млн. рублей против 1 млн. рублей в начале года).

Еще один фактор, повлиявший на рост потребительского спроса, — льготное кредитование.

По указу президента № 371 около 80% населения получили возможность для приобретения отечественных товаров привлекать льготные банковские кредиты. Потребители такой возможностью воспользовались.

Задолженность населения перед банками по кредитам, привлеченным на потребительские нужды, выросла за этот год на 300 млрд. рублей, достигнув к 1 октября рекордных 5,86 трлн. рублей.

Рост потребительского спроса рассматривается в Беларуси как один из инструментов «разогрева» белорусской экономики. Это позволяет стимулировать внутренний спрос и тем самым увеличивать объем реализации потребительских товаров.

Правда, у этого инструмента есть не только плюсы, но и минусы. Министр экономики Беларуси Николай Снопков прогнозировал в июле этого года, что во втором полугодии страна может получить отрицательные последствия, вызванные «разогревом» экономики.

«Дальнейший «разогрев» экономики, — говорил министр, — может привести к усилению инфляционного давления, к росту дефицита текущего счета платежного баланса, негативно отразится на валютном рынке».

По итогам третьего квартала можно говорить, что министр в своем прогнозе не ошибся. Стимулирование внутреннего спроса привело не только к росту потребления отечественной продукции, но и к увеличению продаж импортных товаров. А это, в свою очередь, усилило рост дефицита текущего счета платежного баланса.

На примере непродовольственных товаров хорошо видно, что за последний год доля импорта возросла практически по всем позициям. Об этом видно из таблицы Белстата.

Мы видим, что стимулирование внутреннего потребительского спроса привело к росту спроса на импортные товары. То есть дало эффект противоположный тому, на который рассчитывало правительство.

Наряду с льготным кредитованием белорусское правительство в этом году активно использует еще один важный инструмент, способствующий росту внутреннего спроса. Речь идет о жилищном кредитовании.

Как удалось выяснить Naviny.by, в этом году существенно вырос объем льготных кредитов, выданных банками населению под приобретение или строительство жилья. Если в начале этого года задолженность населения банкам по льготным жилищным кредитам составляла 7,8 трлн. рублей, то к 1 октября увеличилась на 47,2% — до 11,5 трлн. рублей.

Однако у стимулирования жилищного строительства, отмечает эксперт, есть одно «но» — финансовая сторона. Крайне сомнительно, что банкам может быть выгодно льготное финансирование жилищного строительства. Будь оно так — многие банки включились бы в жилищную программу. Однако этого не происходит.

Основным кредитором жилья в Беларуси остается государственный «Беларусбанк». По последним данным, на его долю приходится более 92% средств, выданных банками населению на приобретение или строительство жилья. Другие банки в кредитовании жилья слабо представлены.

Так, на долю «Приорбанка» приходится всего 1,9% жилищных кредитов населению, на «БПС-Банк» — 1,5%, на «Белинвестбанк» — 1%, на остальные банки — всего 3,4%.

Таким образом, можно предположить, что льготное кредитование жилья — инструмент скорее административный, появление которого вызвано не желанием банков, а стремлением государства стимулировать внутренний спрос.

По мнению эксперта, курс на «разогрев» экономики оказывает дополнительное давление на банковский сектор и создает инфляционное давление на экономику. «В 2009 году такую политику можно было приветствовать — перед страной стояла задача выйти из рецессии. Однако сейчас целесообразность такой политики вызывает все больше вопросов», — говорит Дмитрий Крук.

Понятно, что стимулирование внутреннего спроса в этом году связано в первую очередь с политической задачей — достичь во чтобы то ни стало показателей социально-экономического развития, запланированных на 2010-й. Однако пока темпы экономического роста существенно отстают от планов: за январь-сентябрь темп роста ВВП составил 6,6% (при прогнозе на год — 11-13%).

# НЕКЛЯЕВ ПРОБУЕТ ВЫТОЛКНУТЬ ЛУКАШЕНКО ИЗ ПРОРОССИЙСКОЙ НИШИ

Накануне президентских выборов у официального белорусского лидера пытаются окончательно отобрать российский козырь. В один день Александр Лукашенко встретился с Геннадием Зюгановым, а Владимир Некляев, конкурент действующего руководителя Беларуси, презентовал свою внешнеполитическую доктрину с пророссийским лейтмотивом.

На фоне встречи с Зюгановым инициативу на российском направлении пытаются перехватить некоторые из нынешних потенциальных кандидатов в президенты Беларуси. В какой-то мере эту карту разыгрывает Андрей Санников, но особенно четко позиционирует себя в этом плане Владимир Некляев.

Презентуя 28 октября в Минске основы своей внешнеполитической стратегии, он пообещал в случае победы подписать с Россией программу ответственного соседства. И первый свой визит совершить именно «на восток» (надо думать, имелся в виду не Пекин).

Евросоюз был политкорректно упомянут на пресс-конференции в том смысле, что модернизацию без Запада не потянуть. А вообще, мол, ЕС нам в обозримой перспективе не светит.

Зато лидер кампании «Говори правду!» обещает сохранить российские военные объекты на белорусской земле. Он призвал также не демонизировать капитал, поглядывающий с востока на активы синеокой республики. «Российский капитал должен скупать здесь то, что и так, по сути, зависит от России», — убежден Владимир Некляев. Например, нефтепроводы, НПЗ.

В общем, поэт со стажем и дебютант в политике наговорил достаточно, чтобы получить по полной программе от старой гвардии из БНФ и всего проевропейского крыла оппозиции.

Но голосовать-то будет народ. Может, учитывая еще довольно высокий потенциал пророссийских настроений в массе электората, эта игра на поле действующего президента как раз и даст эффект?

«Некляев пытается выйти за пределы традиционного электората оппозиции и вклиниться в электорат Лукашенко», — отметил в интервью для Naviny.by эксперт аналитического центра «Стратегия» (Минск) Валерий Карбалевич.

По мнению политолога, это легче было бы сделать, будь Некляев единым кандидатом. Тогда он почти автоматом стягивал бы на себя оппозиционный электорат. А так есть риск и этот слой потерять, и сторонников Лукашенко в свою веру не обратить.

Не слишком велики и шансы получить мощную поддержку Москвы. «Кремль не хочет серьезно играть с белорусской оппозицией не столько даже из-за того, что она в основном прозападная, сколько из-за ее маргинальности», — считает Валерий Карбалевич. По этой причине и к кандидатам с пророссийским кредо отношение у правящих кругов восточной соседки сдержанное (что подтвердил и знаменитый брифинг Нарышкина).

Действительно, скажем, на Украине Янукович и Ющенко в пору соперничества были в одной весовой категории, к тому же там без дураков считали голоса. И тогда у Москвы был резон ставить на того, кто казался своим. В сегодняшней же белорусской ситуации, подчеркивает Карбалевич, «когда Кремль видит, что выборов, по сути, нет, какой ему смысл серьезно ввязываться в игру?».

Некляев в общих чертах «пообещал быть лучшим интегратором, чем Лукашенко, влить новое вино в старые мехи, но не обозначил четкую позицию по конкретным вопросам взаимоотношений с Россией», подчеркнул в интервью для Naviny.by политолог Алесь Логвинец.

И в самом деле, вот Путин, например, недавно вновь заявил об интересе Москвы перейти на единый рубль. Некляев за или против? Вот Лукашенко против, и в этом плане его поддерживают все незалежніки. Потому что единый рубль — каюк независимости.

И если Некляев против (плюс, скажем, против признания Абхазии и Южной Осетии — это тоже принципиальный тест), то у него в случае гипотетической победы будут ровно такие же трения с Москвой, как и у нынешнего главы Беларуси.

Уж нынешний-то лидер еще как хотел с Россией дружить, ее рынок не потерять и все такое, что обещает Некляев. Но нашла коса на камень. И не только из-за особенностей натуры белорусского партнера, сколько в силу специфических черт российской внешней политики.

Если уж самый пламенный прежде постсоветский интегратор стал всерьез отстраивать энергетические и прочие альтернативы, повез нефть танкерами из Латинской Америки, — значит, «предъявы» с востока оказались неприемлемыми. Значит, там вырисовался реальный капкан.

И где гарантия, что такой же капкан на восточном направлении не ждет любого нового президента Беларуси, будь он трижды прогрессивный, с чистейшими помыслами и все такое?

Предлагаемая оппозиционным претендентом программа ответственного соседства с Россией — это, конечно, звучит красиво. Но для танго нужны двое. И вопрос в том, подчеркивают независимые белорусские эксперты, насколько готова соблюдать кодекс ответственного соседства большая страна с постимперским синдромом, «газовым оружием» наготове, хищным альянсом олигархов и высшей власти — короче, целым набором факторов, из-за которых Кремль на постсоветском пространстве напоминает слона в посудной лавке.

Строить прожекты идиллического партнерства без учета специфики нынешней России — абсолютно несерьезно. «Единственная качественная альтернатива нынешней политике белорусских верхов — европейская альтернатива», — убежден Алесь Логвинец. Россия сама задыхается без модернизации, там — коррупция и гигантское расслоение.

Даже если взывать к «колбасным интересам» белорусского электората, отмечает собеседник, то именно европейская интеграция открывает наиболее вероятный путь к богатому и справедливому обществу. Посмотрите на восток и посмотрите на запад. И сделайте выводы.

**Александр КЛАСКОВСКИЙ.**

# ЭЎРОПА АЦЭНЬВАЕ СУМЛЕННЫЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ НА 3 МІЛЬЯРДЫ ЭЎРА

**Прэс-канфэрэнцыяй у гатэлі «Эўропа» завяршылі свой візыт у Менск міністры замежных справаў Нямеччыны і Польшчы Гіда Вэстэрвэле і Радаслаў Сікорскі. У сумеснай заяве яны заклікалі беларускія ўлады правесьці свабодныя, дэмакратычныя і транспарэнтныя выбары.**

Міністры паведамілі, што падчас сустрэчаў з кандыдатамі ў прэзыдэнты Беларусі і падчас перамоваў з Аляксандрам Лукашэнкам, заявілі, што Беларусь стаіць на раздарожжы. І адна з дарог вядзе да больш блізкага супрацоўніцтва з Эўразьвязам. Аднак, паводле **Радаслава Сікорскага,** гэта дарога прадугледжвае захаваньне правоў чалавека і, у прыватнасьці, меншасьцяў і свабодныя, дэмакратычныя і транспарэнтныя выбары.

«Для нас вельмі важны ня вынік выбараў, але іх якасьць. Прадстаўнікі апазыцыі выказалі нам сваю занепакоенасьць, што апазыцыя ня мае шанцаў, каб трапіць у выбарчыя камісіі і ня мае дастатковага доступу да мэдыяў. Дэмакратычныя выбары — гэта ня толькі дакладаны падлік галасоў, але і дэмакратычнае асяродзьдзе цягам тыдняў, месяцаў напярэдадні выбараў. Мы ловім на слове прэзыдэнта Беларусі, што гэтыя выбары будуць іншымі, чым папярэднія. І калі выбары будуць дэмакратычнымі, то мы зробім усё магчымае ня толькі ў сваіх краінах, але

Дэмакратычныя выбары — гэта ня толькі дакладаны падлік галасоў, але і дэмакратычнае асяродзьдзе цягам тыдняў, месяцаў напярэдадні выбараў. і ў эўрапейскіх інстытуцыях, каб Беларусь магла мець карысьць ад значна больш блізкіх стасункаў з Эўразьвязам».

Міністры заявілі, што адразу пасьля візыту вышлюць эўрапейскім калегам Эўракамісіі супольную тэлеграму з парадай накіраваць назіральнікаў і ўважліва назіраць за выбарамі ў Беларусі.

**Гідэ Вэстэрвэле** адзначыў, што правядзеньне свабодных і чэсных выбараў азначае магчымасьць свабодна і безь перашкодаў распаўсюджваць свае ідэі і мець доступ да мэдыяў, да выбарцаў сваёй краіны. Ён адзначыў, што тэма свабодных і справядлівых выбараў застанецца пад увагай цягам бліжэйшых тыдняў. Спадар Вэстэрвэле сказаў, што пасьля размовы з апазыцыйнымі кандыдатамі яшчэ больш пераканаўся, што сумесны візыт у Беларусь быў правільным рашэньнем, і што ён адбыўся ў правільны момант. Маўляў, цяпер мы зводзім стрэлкі ў накірунку свабодных і чэсных выбараў.

«У палітыцы шмат залежыць ад правільнага выбару моманту. Цяпер мы бачым дыскусіі паміж Расеяй і Беларусьсю. У інтарэсах Беларусі будаваць больш трывалы мост у Эўропу. І вядома, на якіх апорах стаіць гэты мост — прававая дзяржава, дэмакратыя і правы чалавека».

Калі выбары пройдуць свабодна і адкрыта, адзначыў Радаслаў Сікорскі, то Беларусь зможа разьлічваць на эўрапейскую дапамогу ў памеры трох мільярдаў эўра.

Падводзячы вынікі візыту міністраў, кандыдат у прэзыдэнты Андрэй Саньнікаў адзначыў: добра, што яны сустрэліся з апазыцыяй, бо раней ні кожны раз уплывовыя эўрапейскія палітыкі падчас візыту ў Беларусь адважваліся сустракацца з апазыцыйнымі палітыкамі:

«Гэта быў вельмі цікавы візыт, бо гэта былі дзьве краіны. Цікавасьці дадало і тое, што Сікорскі і Вэстэрвэле перад гэтым сустракаліся зь міністрам замежных справаў Расеі Лаўровым, і тэма Беларусі там узнімалася. І гучалі амаль што аднолькавыя меркаваньні наконт сытуацыі. Гэта вельмі важна. І тое, што яны падкрэсьлілі сваю прынцыповую пазыцыю па дэмакратычных стандартах, бо менавіта іх выкананьне будзе крытэрам стасункаў зь Беларусьсю, і тое, што яны пацьвердзілі сваю зацікаўленасьць у тым, каб Беларусь узмацняла сувязі з Эўропай. Не хапае сумленных і празрыстых выбараў. Гэта важна».

**Алесь Дашчынскі.**

# ПАДЛОДКА «КУРСК» У БЕЛАРУСКІМ СТЫЛІ

Сведкі пра новых памерлых у выніку выбуху ў Пінску, што прыходзяць кожны дзень, агаляюць не толькі рэальны памер трагедыю, але і памер маральнай прорвы ў нашым грамадстве, і, на жаль, у нашай грамадзянскай супольнасці.

Нам усім хацелася, каб ахвяраў было меней — але іх стала болей.

У нас усіх былі іншыя справы, і мы спадзяваліся, што бядзе дадуць рады тыя, хто мусіць даваць рады ў гэтых сітуацыях — але мы не ўзгадалі, у якой краіне мы жывём.

У Пінску, дзе я быў на гэтых выходных, пануе атмасфера пакінутасці. Людзі не вераць, што мы пра іх бяду ведаем нашмат больш, чым яны самі. Адчуванні, што кінуты сам-насам, ва ўсіх.

Усе цытуюць, колькі тэлеграмаў віншаванняў і спачуванняў даслаў за апошні дзень Лукашэнка (зводкі БТ успрымаюцца як суцэльны здзек) і колькі не разумее, чаму беларускі лідэр не завітаў у Пінск падчас вандроўкі па Берасцейшчыне.

Да мясцовых уладаў пытанняў якраз менш, чым да іншых (не тое, што іх няма, але іх менш). Тыя пастараліся з кампенсацыяй (можна спрачацца пра яе памеры), банкі і сам «Пінскдрэў» згадзіліся пагасіць крэдыты тым, хто трапіў у бяду, у горадзе абвешчана жалоба, праводзяцца дабрачынныя акцыі. Аднак відавочна, што на версе хутчэй зацікаўлены ў перадухіленні піяр-правалу падчас перадвыбарчай кампаніі.

Трагедыя ў Пінску — гэта тэст на сапраўднасць пэўных апазіцыйных ініцыятываў, якія расквітнелі падчас выбараў. Каб дапамагчы людзям, трэба рэальныя людзі ў канкрэтным месцы, якія б маглі дапамагчы сабраць інфармацыю і дастукацца да людзей якім патрэбна дапамога і якія могуць нешта змяніць. У канкрэтных дзеянняў зусім іншая логіка, чым у віртуальнага піяр-праекту.

Што да абвінавачванняў то калі чалавек шчыра хоча дапамагчы людзям (а дзеля гэтага яны збіраюцца ў прэзідэнты, здаецца) то выбар паміж шанцам на дапамогу і піярам мусіць быць адназначным. Калі чалавек, які хоча ўскінуць на сябе адказнасць за ўсю дзяржаву, адвернецца ад чужой біды, толькі каб захаваць некалькі адсоткаў галасоў, то, даруйце, мне не патрэбны такі прэзідэнт. Аднаго такога, здаецца, ужо маю.

Аднак час не для ўзаемных папрокаў. Аблажаліся, не праявілі нармальнага грамадзянскай, нават чалавечай рэакцыі ўсе ці амаль усе — як на ўладным, так і на апазіцыйным фланге.

Мы не ў стане змяніць Беларусь, калі мы не ў стане змяніць саміх сябе.

Па-першае, шмат хто з людзей гатовы дапамагчы, але не можа гэтага зрабіць з банальнай прычыны, што дапамагчы не тое што няма каму, а не праз каго. Патрэбны нейкі пункт для збору і пераводу дапамогі, рахунак або іншы спосаб. Або запатрабаваць, каб такое зрабіла ўлада, або Чырвоны крыж, або збіраць самім.

Па-другое, пацярпелыя пры аварыі знаходзяцца ў жудасным стане. Траўмы і апёкі запатрабуюць доўгага лячэння і рэабілітацыі. Патрэбна прынамсі спраўдзіць, што ў Беларусі дастаткова тэхнічных магчымасцяў, лекаў і адмыслоўцаў, каб аказаць ім дапамогу. Адказу, ці дастаткова, у мяне пакуль няма, але прэса, няўрадавыя арганізацыі, мусяць гэта спраўдзіць. Шліце запыты, стаўце пытанні, патрабуйце адказу і, калі патрэбна дапамога па гэтай лініі, трэба думаць далей, дзе яе шукаць. Прынамсі, не лішняе, каб запатрабаваць адпаведных зменаў у рэспубліканскі бюджэт.

Па-трэцяе, пытанне працаўладкавання людзей, якія цяпер пазбавіліся працы.

«Пінскдрэву», Пінску для гэтага запатрабуюцца пэўныя інвестыцыі. Наколькі мне вядома, абсталяванне на заводзе было застрахавана і сітуацыя шмат у чым папраўная, але людзям патрэбна праца, заробак, сродкі для існавання тут і цяпер. Для пачатку варта было б запатрабаваць ад улады, каб змяніла сваю інвестыцыйную палітыку ў Берасцейскай вобласці і адмовілася б ад аднаго абрыдлага ўсім спартовага аб'екта, каб адрадзіць вытворчасць на «Пінскдрэве».

Адкладзем у бок палітычныя калькуляцыі і ўстрымаемся ад узаемных абвінавачванняў у тым, што нехта чагосьці не ў час зрабіў. І проста пачнем выпраўляць агульныя памылкі. Бо Пінск — гэта наш супольны «Курск», супольная «Катрына»,і выбраца з маральнай ямы можна толькі разам і толькі адназначна расставіўшы прыярытэты.

**Віталь Сіліцкі.**

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў

**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742

**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна